**УДК 392.2(476)** **DOI 10.52928/2070-1608-2023-67-2-119-123**

# ПАЎТОРНАЕ ВЫКАРЫСТАННЕ НАДМАГІЛЛЯЎ У БЕЛАРУСІ: ФОРМЫ, ПРАКТЫКІ, РЭЦЭПЦЫІ

***канд. гіст. навук С.У. ГРУНТОЎ***
***(Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0001-5316-1180***

*У артыкуле разглядаюцца практыкі паўторнага выкарыстання надмагілляў у Беларусі, пераважна, на прыкладах з канца XIX – пачатку XXI ст. Вылучаюцца асноўныя формы паўторнага выкарыстання помнікаў у залежнасці ад іх прагматыкі. Паўторнае выкарыстанне паказваецца як устойлівая культурная форма. Разглядаюцца прычыны табуізацыі паўторнага выкарыстання помнікаў у культуры. Разглядаецца праблема дэсакралізацыі і тыя варыянты паўторнага выкарыстання помнікаў, дзе яна не адбываецца.*

***Ключавыя словы****: могілкі, помнік, надмагілле, мацэва, дэсакралізацыя, мемарыяльная архітэктура.*

Вясной 2023 г. на адным з беларускіх інтэрнэт-аукцыёнаў быў выстаўлены на продаж лот, які выклікаў супярэчліваю і эмацыянальную рэакцыю ў людзей, якія пазнаёміліся з ім. Прадавец з Маладзечна прапанаваў набыць жорнаў, зроблены з яўрэйскага надмагілля (мацэвы) [6]. Пры бліжэйшым разглядзе выявілася, што гэта не жорнаў, а тачыльны камень, што ніяк не змяніла сітуацыі. Выява ільва, які ламае дрэва і габрэйскія літары пад ім ясна сведчылі, што перад намі прыклад мацэвы, якая была забрана з яўрэйскіх могілак і ўжыта для побытавых патрэб. Сама спроба продажу яе, ператварэння ў тавар, у многіх выклікала асуджэнне. Пытаннем стаў і статус прадмета: гэта тачыльны камень ці ўсё яшчэ надмагілле?

Паўторнае выкарыстанне надмагілляў традыцыйна выклікае рэакцыю асуджэння і неразумення ў тых, хто з ёю сутыкаецца, у чым аўтару не раз даводзілася пераканацца падчас шматгадовых даследаванняў беларускім могілак, абмеркавання іх у дыскусіях і падчас інтэрв’ю. Здаецца, існуе кансэнсус адносна таго, што паўторнае выкарыстанне помнікаў парушае пэўнае табу і служыць прыкметай культурнага ўпадку грамадства ў пэўны перыяд. Канстатуючы гэта, па-за коскамі застаецца пытанне адносна прычын устойлівасці такога табу; пры бліжэйшым разглядзе розных выпадкаў аказваецца, што за паўторным выкарыстаннем надмагілляў могуць стаяць вельмі розныя культурныя практыкі з рознай прагматыкай, якія, як мінімум, патрабуюць дыферынцыяванага падыходу да сябе.

Тэма, відавочна, заслугоўвае больш пільнага разгляду, да чаго аўтар звернецца ў гэтым артыкуле. Сярод іншага, мы будзем імкнуцца праліць святло на наступныя пытанні: 1) якія формы паўторнага ўжывання помніка магчыма вылучыць і чым яны адрозніваюцца ў сваёй прагматыцы? 2) наколькі можна казаць пра паўторнае выкарыстанне помнікаў як пра ўстойлівую культурную форму? 3) наколькі гэтую практыку карэктна апісваць праз катэгорыю дэсакралізацыі мемарыяльнага аб’екта?

Для пачатку патрэбна расшырыць геаграфічныя і часавыя рамкі разумення праблемы, таму што вельмі часта існуе тэндэнцыя ўспрымаць яе як пераважна з’яву савецкага перыяда. Канешне, гэта не так: у якасці вельмі ранняга прыклада варта ўзгадаць надмагілле Афанасія Андрэевіча Скародкі і яго жонкі Фядоры, пастаўленае ў 1599 г. у царкве Святога Мікалая ў Пінску, якое ўжо ў 1615 г. было ўжыта паўторна, каб стаць надмагіллем злотніка Ждана і яго жонкі [8, с. 94–95]. Аналагічным чынам, практыка паўторнага выкарыстання помнікаў была добра вядома за межамі Беларусі ці савецкай краіны. У Польшчы пасля 1945 г. большасць нямецкіх могілак з далучаных тэрыторый сістэматычна знішчалася: помнікі ішлі ў камнедрабільныя машыны ці выкарыстоўваліся майстэрнямі для вырабу новых надмагілляў. Падчас Вялікай Французскай рэвалюцыі ў Парыжы і іншых месцах касцёлы і кляштары сталі аб’ектамі сістэматычнага разрабавання. Пацярпелі і многія надмагільныя помнікі, пачынаючы з каралеўскай пахавальні ў саборы Сэн-Дэні. У 1801 г., калі ў Парыжы быў завершаны адзін з першых крытых гандлёвых павільёнаў, “Каірскі пасаж” непадалёк ад вуліцы Сэн-Дэні, выявілася, што “месцамі ён забрукаваны надмагільнымі плітамі, з якіх нават не патрудзіліся выдаліць гатычныя надпісы і эмблемы” [1, с. 204].

Можна сцвярджаць, што паўторнае выкарыстанне надмагілляў – гэта ўстойлівая культурная практыка, вядомая ў розныя часы і на розных тэрыторыях. У залежнасці ад кантэксту і ўзросту надмагілляў ёй могуць надаваць негатыўнае значэнне ці яна можа ўспрымацца як нешта натуральнае і не выклікаць здзіўлення. Апошняе аказваецца магчымым, калі час узнікнення надмагільнага помніка і сітуацыю яго новага выкарыстання раздзяляюць стагоддзі, так што яго ранейшае значэнне аказваецца практычна цалкам сцёртым. Такой, напрыклад, можа быць сітуацыя паўторнага ўжывання неапрацаванага надмагільнага каменя на вясковых могілках. Цалкам магчыма, што ён служыў надмагільным знакам над пахаваннем ранейшых стагоддзяў, але адсутнасць надпісаў ці іншых знакаў вельмі хутка ператварае яго проста ў камень, які зноў можа быць выкарыстаны як надмагільны, пры гэтым з нанясеннем на ім знака крыжа і кароткай інсткрыпцыі.

У большасці выпадкаў, якія будуць разгледжаны ніжэй, паўторнае выкарыстанне з’яўляецца ўсвядомленым: пра яго ведаюць і замоўцы, і майстры; у тых выпадках, калі надмагілле выкарыстоўваецца як помнік іншаму нябожчыку, яно вельмі часта захоўвае сляды такой практыкі. Гэта, напрыклад, бачна на згаданым вышэй надмагіллі з Пінска, дзе два тэксты ўтвараюць своеасаблівы палімпсест. Перад тым, як перайсці да разгляду сітуацый

і практык свядомага паўторнага выкарыстання надмагільных помнікаў, варта задацца пытаннем, чаму яны звычайна выклікаюць негатыўную рэакцыю і пераважна табуяваны ў культуры?

Прычын гэтаму можна назваць даволі шмат – вылучым толькі тры асноўных. Па-першае, надмагілле ў розных прадстаўленых у Беларусі культурах, прынамсі, калі размова ідзе пра каменны помік, успрымаецца як знак, які павінен максімальна доўга захоўваць памяць пра памерлую асобу, а ў ідэале – вечна. Пра гэта наўпрост згадваецца ў многіх эпітафіях і асабліва ў пачатковых формулах “Вечная памяць…”, “D.O.M. wieczności...” і інш. Кожны чалавек ставіць помнік свайму блізкаму ў спадзяванні на тое, што ён прастаіць стагоддзі, нават калі самога фундатара помніка ўжо не будзе на свеце. Справа захавання памяці, такім чынам, ад асобнага чалавека экстрапалюецца на ўсю супольнасць, ад якой спадзявана чакаюць, што яна не будзе рушыць могілкі і помнікі і, па магчымасці, будзе захоўваць іх у добрым стане. Гэта знаходзіць свой адбітак у папулярных заключных формулах эпітафій: “Остановись, прохожий…”, “Przechodniu, zmów...” і іншых. Зразумела, мы можам казаць пра наяўнасць толькі імпліцытнай, не фармалізаванай канвенцыі, але яна з’яўляецца дастаткова трывалай і ўніверсальнай, каб парушэнне яе выклікала зразумелае ўсім абурэнне, а менавіта яскравым прыкладам такога парушэння і з’яўляецца паўторнае выкарыстання надмагілля.

Па-другое, надмагілле з’яўляецца рэпрэзентантам асобы памерлага чалавека. Гэта азначае, што на яго пераносяцца многія практыкі, якія паўтараюць формы кантакта з жывым чалавекам. З помнікамі размаўляюць, іх мыюць, часам іх абдымаюць, а партрэты памерлых нават цалуюць [3]. Да помнікаў прыносяць дары памерлым у памінальныя дні. Помнік замяшчае фізічную адсутнасць пахаванага пад ім чалавека. Усё гэта прыводзіць да таго, што, напрыклад, замена помніка часта сутыкаецца са складанай дылемай: паставіць новае надмагілле на месцы састарэлага магчыма, але што рабіць з папярэднім? Рэпрэзентант блізкага чалавека, які гадамі і дзесяцігоддзямі фарміраваў камунікатыўны фокус падчас прыходаў на могілкі не можа проста так быць выкінуты на сметнік. Звычайна, майстры, якія ставяць новы помнік, разбіваюць ранейшы на невялікія кавалкі, так каб ён перастаў існаваць у якасці фізічнага аб’екта і знака. Пры гэтым, часцей за ўсё партрэтныя медальёны, як квінтэсэнцыю асабовага ў помніку, захоўваюць. Іх ці то прымацоўваюць да новага помніка, ці, калі партрэты на іх новыя, выкананыя ў сучаснай тэхніцы гравіроўкі, старыя медальёны могуць проста стаяць пры аснаванні помніка ці з адваротнага ад яго боку [3]. Пры такім стаўленні да надмагілля ідэя паўторнага яго выкарыстання падаецца абсалютна непрымальнай – ажыццяўленне яе магчымае толькі праз сімвалічнае знішчэнне папярэдняй асобы, дзеля ўшанавання памяці каторай ён быў пастаўлены.

Па-трэцяе, і гэта часткова павязана з папярэдняй прычынай, надмагілле ў культуры з’яўляецца сакральным аб’ектам, што рэгламентуе стаўленне да яго і практыкі кантакту з ім. Сакральнае пры гэтым тут разумеецца ў антрапалагічнай перспектыве, як тое, што злучае канатацыі свяшчэннага і брыдоты [7]. З аднаго боку, з’яўляючыся рэпрэзентантам памерлага, помнік прадстаўляе тое, што належыць сферы замагільнага жыцця, іншаму свету, а значыць па вызначэнні мае дачыненне да шанаванага, свяшчэннага. З іншага боку, помнік знаходзіцца на могілках у зоне, якая ў культуры павязана з негатыўнымі канатацыямі рытуальнай нечысціні. Магіла і помнік належаць сферы смерці і фізічнага раскладання, схаванага ад вачэй падчас пахавання. Выраслыя на могілках ягады нельга збіраць, дрэвы – выкарыстоўваць у гаспадарчых патрэбах, зямля з магілы выкарыстоўвалася ў шкаданоснай магіі і г.д. Яшчэ больш моцна ўяўленні пра могілкі як пра нячыстае месца развіты ў яўрэйскай культуры, у цэлым вельмі моцна засяроджанай на рытуальнай чысціні/нечысціні. Яўрэі нячаста наведвалі могілкі, не жадаючы лішні раз турбаваць сваіх памерлых, але само наведванне на нейкі час надавала чалавеку рытуальную нечысціню. Па гэтай жа прычыне яўрэскія могілкі павінны былі заўсёды размяшчацца за межамі гарадоў, у той час як у хрысціян, і нават пасля могілкавай рэформы канца XVIII ст., пахаванні вакол храма ці ў крыпце пад ім, гэта значыць у непасрэднай блізкасці ад паўсядзённага пражывання і правядзення набажэнстваў, не былі рэдкасцю. Таму, што ў іўдзейскай, што ў хрысціянскай перспектывах, паўторнае выкарыстанне надмагілляў, асабліва ў прафаннай сферы, было немагчымым – гэта азначала б літаральна апаганьванне жылой прасторы, наданне ёй статусу рытуальнай нечысціні.

Названыя тры прычыны фарміруюць згаданае негатыўнае стаўленне да паўторнага выкарыстання надмагільных помнікаў у культуры і ставяць на ім табу. Тым не меньш, гэта культурная практыка паўтараецца з заўважнай рэгулярнасцю ў розныя часы і на розных тэрыторыях, што падштурхоўвае задацца пытаннем: чаму так рэгулярна табу аказваецца парушаным і якія формы гэтае парушэнне прымае?

У першую чаргу гэта адбываецца ў час істотных гістарычных і сацыяльных зломаў, пры тым што называецца зменай эпох, у перыяды войнаў і рэвалюцый. Пры гэтым парушэнне табу можа праходзіць як у стыхійных, так і ў спланаваных формах, нярэдка злучаючыся паміж сабою, напрыклад, падчас ініцыяваных “зверху” капаній, якія пасля могуць рэалізоўвацца з апорай на нізавую ініцыятыву.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. могілкі сталі адною з кропак прыкладання сімвалічнай палітыкі бальшавікоў, якія вялі дастаткова паспяховае змаганне са “старым светам”, так што пад ударам апынуліся не толькі цэлыя страты насельніцтва, але і аб’екты матэрыяльнай спадчыны, такія як храмы і шляхецкія сядзібы, а таксама і могілкі [9, с. 151–162]. Могілкі пасля прыняцця ў снежні 1918 г. “Дэкрэта пра могілкі і пахаванні” сталі часткай камунальнай (а не царкоўнай) уласнасці. На практыцы гэта прывяло да пахавальнага крызісу ў маштабах цэлай краіны. У сітуацыі, дзе нават новыя пахаванні стваралі праблему, ранейшыя надмагіллі не толькі не ахоўваліся, але і адкрыта трактаваліся як часткі перажыткаў мінулага, да якіх можна ставіцца як да рэсурса ў гаспадарчай дзейнасці. У першую чаргу гэта датычылася даражэйшых помнікаў, зробленых з мармура, вапоўніка, лабрадарыта і іншых каштоўных парод каменю. Іх можна было выкарыстаць паўторна ці ўжыць для абліцоўкі будынкаў.

Калі такой патрэбы не было, то помнікі маглі разбівацца на бут, ісці на брукаванне вуліц. Так, у 1934 г. у Мінску цэнтральную вуліцу Леніна выбрукоўвалі фрагментамі надмагілляў са Старажоўскіх могілак, пра што заклапочаны мінчанін напісаў у газету “Праўда”, перажываючы, што гэта можа дыскрэдытаваць савецкую ўладу. Ва ўказаннях, якія былі перасланыя кіраўніку БССР Галадзеду сам факт такога выкарыстання надмагільных помнікаў не выклікаў пярэчанняў. «Выкарыстанне каменя (надмагільных пліт) для будаўніцтва праводзіць умела і акуратна. Неабходна прапанаваць Гарсавету (Камунгасу) апрацоўку іх праводзіць не на вуліцы, дзе гэта кідаецца ў вочы ўсім мінакам, а ў закрытым памяшканні. Надпіс рупліва сцерці ці зрэзаць» [10, с. 724].

Такія формы паўторнага выкарыстання мала чым адрозніваліся ад знішчэння – і асабліва гэта датычылася металічных і драўляных помнікаў. Падчас пахавальнага крызісу 1918 – 22 гг. у Віцебску звычайнай справай стала рабаванне могілак. Металічныя крыжы здавалі на металалом, а драўляныя агароджы, скамейкі і нават помнікі шлі на дровы. Ва ўмовах татальнага і крызісу і перад страхам змерзнуць такія дзеянні многім больш не падаваліся нечым надзвычайным [4, арк. 74]. З аднаго боку, новастворaныя камунальныя ўлады як маглі змагаліся з несанкцыянаванымі рабаваннямі, а з іншага – распрацоўвалі праект поўнага знішчэння ўсіх старых гарадскіх могілак і ператварэння іх у паркі: “неабходна ўсе могілкі ў самім горадзе зачыніць, ператварыць іх у сады, забяспечыўшы правільны нагляд і абсадзіўшы дрэвамі тыя з іх, якія не абсаджаныя, хоць трэба сказаць, што амаль усе хрысціянскія могілкі маюць добрую зеляніну і толькі яўрэйскія пазбаўлены такой; такім чынам будзе значна аздароўлены горад, бо могілкі, калі перастаць хаваць на іх нябожчыкаў, заменяць сабою скверы, якіх у Віцебску вельмі мала” [5, арк. 81]. Канешне, такая логіка, рэалізаваная ў большай ці меншай ступені ў многіх беларускіх гарадах, прадугледжвала вываз помнікаў на смецце ці паўторнае іх выкарыстанне, якое, такім чынам, адбывалася са згоды ўладаў. Праз падобныя крокі была сфарміравана спецыфічная культурная парадыгма стаўлення да гістарычных могілак у БССР, якая як норму падавала магчымасць іх паступовага знішчэння ў залежнасці ад горадабудаўнічых патрэб. Сапраўды, роля ўладаў у знішчэнні могілак і пашырэнні практыкі паўторнага выкарыстання надмагілляў была высокай, але гэта не павінна пакідаць у цяню і чыста сацыялагічныя фактары, якія рабілі прымальнай пераадоленне табуяванага стаўлення да надмагілляў на нізавым узроўні выканаўцаў.

Могілкі – гэта найперш месца, якое служыць захаванню памяці пра памерлых асобных сем’яў і, у шырэйшай перспектыве, мясцовай супольнасці. У сітуацыі калі ў памерлых не застаецца жывых сваякоў у тым жа горадзе ці вёсцы, дзе яны пахаваны, магілы непазбежна пачынаюць прыходзіць у заняпад. Такая сітуацыя развіваецца натуральным чынам з цягам часу, але можа быць паскорана і стаць масавай, напрыклад пасля войнаў, генацыдаў, вымушаных масавых міграцый і іншых сацыяльных катаклізмаў. “Нічыйнымі”, а значыць безабароннымі, могуць стаць цэлыя могілкі.

Асабліва моцна на сабе гэта адчула яўрэйская супольнасць. Пасля Халакосту ў многіх гарадах і мястэчках, асабліва на захадзе Беларусі, яна не ў стане была адрадзіцца, а яе могілкі сталі месцам памяці пра тое, што яна калісці існавала, і паступова прыходзілі ў заняпад. Для прадстаўнікоў хрысціянскай культуры стаўленне да мацэваў не было такім табуяваным, як да надмагілляў уласнай культуры. Гэтыя аб’екты належалі іншай, незразумелай ужо на ўзроўні графікі, культуры; часта яны знаходзіліся на могілках, знішчаных да такой ступені, што яны амаль пераставалі такімі ўспрымацца. Нельга сказаць, што сакральныя канатацыі, прынамсі, негатыўныя, звязаныя з нечысцінёю, маглі знікаць тут цалкам, але значна аслабленыя, яны аказваліся пераадольнымі для асобных людзей, што маглі, напрыклад, зрабіць з мацэвы тачыльны камень.

У святле сказанага вышэй такую сітуацыю магчыма разглядзець не менш як у трох перспектывах: 1) як прыклад дыскрымінацыйнага і дэструктыўнага стаўлення да лакальнай спадчыны прадстаўнікоў этнічнай групы, якая спачатку перажыла генацыд, а пасля вымушана была жыць ва ўмовах дзяржаўнай палітыкі антысемітызму ў паваенны перыяд; 2) як прыклад прыватнай рэалізацыі сфарміраваных дзяржавай установак у стаўленні да гістарычных могілак як да рэсурса гаспадарчай дзейнасці: у кантэксце сістэмнага знішчэння помнікаў і надмагілляў ператварэнне асобнай мацэвы ў тачыльны камень складана ўспрыняць як надзвычайнае здарэнне; 3) як праяўленне прагматыкі чалавека традыцыйнай беларускай культуры, для якога мацэва з нечытэльным тэкстам на ёй, а тым больш забраная з кантэксту асобных могілак перастае мець нейкае спецыфічнае значэнне і становіцца зручнай нарыхтоўкай для будучага тачыльнага каменя.

Разам з тым, пры аналізе выпадкаў паўторнага выкарыстання надмагілляў нельга забываць, што многія з іх здараліся па-за кантэкстам сацыяльных патрасенняў і яшчэ да савецкай эпохі. Больш таго, гэта маглі быць канвенцыйныя практыкі, легітымізаваныя касцёлам. Ніжэй звернемся да разгляду такіх прыкладаў.

У каталіцкай традыцыі XIX – першай паловы XX ст. была пашырана практыка выкарыстання надмагілляў як будаўнічага матэрыялу пры ўзвядзенні касцёлаў і муроўцы каменных агароджаў вакол цвінтароў ці могілак. Надмагіллі, зробленыя з неапрацаваных гранітных булыжнікаў з выбітымі на іх кустарным спосабам эпітафіямі, звычайна выкарыстоўваліся для пабудовы новых агароджаў пры пашырэнні могілак. Найбольш яскравым прыкладам можна назваць каталіцкія могілкі ў Ракаве, дзе ў агароджы магчыма расчытаць больш за сотню эпітафій ужытых для яе пабудовы надмагілляў. Помнікі лепшага ўзроўню, зробленыя ў прафесійных майстэрнях, таксама ішлі на будоўлю. Яны былі большага памеру, таму іх абразалі пад патрэбныя памеры і выкарыстоўвалі для дэкаратыўнай абліцоўкі парталу касцёла, як, напрыклад, у Крошыне (малюнак), ці ўмуроўвалі ў могілкавую браму, як гэта было зроблена ў Івянцы. Выкарыстанне помнікаў высокага ўзроўню ў якасці будаўнічага матэрыялу было вымушанай мерай, якой надавалі сімвалічнае значэнне. У канцы XIX – пачатку XX ст. пры пабудове новых неагатычных касцёлаў на месцы старых драўляных, звычайна меншага памеру, будоўля часта закранала пахаванні, зробленыя на тэрыторыі старога храма. З улікам, што гэтая зона заўжды лічылася найбольш прэстыжнай, тут размяшчаліся пахаванні заможнай шляхты і святароў, якія вымушана апынаcя пад лініяй забудовы [2; 12].



**Малюнак. – Фрагменты надмагілляў, умураваных у касцёл у Крошыне (Баранавіцкі р-н, Брэсцкая вобл.). Фота аўтара, 2006 г.**

Больш уважлівы разгляд прыкладаў ужывання такіх помнікаў ў дэкоры касцёлаў у Івянцы, Крошыне, Старых Васілішках і іншых месцах дазваляе сцвярджаць, што муляры не толькі не імкнуліся схаваць факт ужывання надмагілляў, але наадварот умуроўвалі іх так, каб змястоўная частка эпітафіі з іменем памерлага і годам смерці заставалася чытальнай (хоць гэта атрымлівалася толькі часткова з-за ліній абрэзкі каменнага блока). Сёння гэта звычайна выклікае здзіўленне, таму што ўспрымаецца як парушэнне згаданага табу – надмагілле не толькі ўжыта паўторна і ўтылітарна, гэта зроблена дэманстратыўна, пры самым уваходзе ў касцёл.

Унутраную логіку гэтай практыкі магчыма зразумець, звярнуўшыся да мемарыяльных традцый касцёла, якія сфарміраваліся ў ранейшыя стагоддзі. Адною з іх, хоць і не безальтэрнатыўнай, быў піетэт і падкрэсленая сціпласць, якая была павязана з прызнаннем кароткабежнасці не толькі зямнога жыцця, але і яго слядоў, а таксама моцным уплывам эстэтыкі “жабрацкіх” манаскіх ордэнаў. Адною, з праяў гэтага была добра вядомая ў Заходняй і Цэнтральнай Еўропе традыцыя размяшчэння надмагільных пліт проста ў падлозе храма, так што па іх штодня праходзілі вернікі. У Беларусі яна была пашырана заўважна меньш, але не была невядомай: узгадаем, напрыклад, літую надмагільную пліту Францішкі Жыбартавай, памерлай у 1820 г., якая да нядаўняга часу знаходзілася перад уваходам касцёла ў Іўі, а пасля была пастаўлена вертыкальна, каб пазбегнуць далейшаму выціранню нагамі вернікаў [11, s. 67]. Другая логіка расла з даўняй традыцыі ўмуроўвання надмагільных і іншых мемарыяльных шыльд у сцены касцёлаў. Гэта была зона прэстыжу, дазволіць знаходжанне ў якой маглі сабе нямногія. Умуроўванне фрагментаў надмагілля ў партал і іншыя часткі храма радыкальна злучае дзве гэтыя традыцыі – пакору і прэстыж – у культурную форму, якая сёння можа выклікаць здзіўленне ці нават абурэнне, але была абсалютна зразумелай сваім сучаснікам.

Варта ўзгадаць і захапленне класікай, якое ў XIX і пачатку XX ст. падтрымлівала сістэма адукацыі з яе добрай ведай грэцкіх і рымскіх аўтараў, урокамі латыні і цікавасцю да археалагічных раскопак. Людзі доўгага XIX ст. бачылі старажытнасць праз прызму фрагментаў, у тым ліку абломкаў надмагільных помнікаў і іншых надпісаў у камені, што захаваліся да нашага дня. Імі папаўнялі музеі і прыватныя калекцыі і эстэтычна падрыхтоўвалі глебу для апісанага выкарыстання надмагільных помнікаў. У адпаведнасці з густамі эпохі такія фрагменты надмагілляў аздаблялі неагатычныя касцёлы – храмы, прэтэндаваўшыя на тое, каб паўтараць узоры Сярэднявечча. Пабудовы імкнуліся быць новымі і старымі адначасова, а фрагменты старых надмагілляў ідэальна падыходзілі для руху ў накірунку гэтай парадаксальнай мэты.

Цікавы прыклад сучаснага паўторнага выкарыстання надмагілляў у дэкоры новага храма можна знайсці на каталіцкіх могілках у Докшыцах. Тут у 2016 г. была пабудавана цагляная могілкавая капліца, у аздабленні якой былі выкарыстаны надмагільныя помнікі з пляцоўкі, якую яна сабою накрыла. Гэта ўсё параўнальна не старыя помнікі, пераважна з перашай паловы XX ст., якія ніяк не вылучаюцца па сваіх мастацкіх асаблівасцях: неапрацаваныя гранітныя камяні выцягнутай формы, часам з металічным крыжам у завяршэнні. Помнікі не былі разрэзаны, як гэта рабілі ў пачатку XX ст., а акуратна замацаваны ў адмысловых нішах, якія рытмічна фланкіруюць сцены капліцы. Надмагіллі, вылучаныя ў своеасаблівыя “рамкі” прыцягваюць увагу не толькі да сябе, але высвечваюць, як нешта вартае ўвагі, дзясяткі падобных сціплых помнікаў, якія атачаюць капліцу. Разам з тым капліца, хоць і пабудаваная нядаўна, аказваецца арганічна павязанай з мінулым і гісторыяй месца, захоўваючы яго ў сабе.

Такім чынам, формы паўторнага ўжывання помніка могуць істотна адрозніваецца па сваёй прагматыцы: яны могуць быць утылітарнымі (выкарыстанне помнікаў як будаўнічага матэрыялу), рытуальнымі (паўторнае выкарыстанне помніка як надмагільнага, але для іншай асобы), эстэтычнымі (выкарыстанне помнікаў у дэкоры сакральных будынкаў і могілкавых агароджаў з частковых захаваннем іх мемарыяльнай функцыі). Паўторнае выкарыстанне помнікаў з'яўляецца ўстойлівай культурнай формай, добра вядомай у розныя часы і ў розных еўрапейскіх народаў; пры гэтым падчас войнаў, рэвалюцый і іншых сацыяльных катаклізмаў, а таксама непасрэдна

пасля іх такое выкарыстанне можа рэзка інтэнсіфікавацца з-за знікнення ці паражэння ў правах асобных груп насельніцтва. Вельмі часта паўторнае выкарыстанне помніка можа быць павязана са свядомай яго дэсакралізацыяй, але ў шэрагу выпадкаў такога дзеяння не адбываецца (напрыклад, пры выкарыстанні надмагілляў для дэкора новазбудаваных храмаў), таму паміж паўторным выкарстаннем помніка і дэсакралізацыяй не можа быць пастаўлены знак роўнасці. Кожны асобны выпадака патрэбна разглядаць асобна, з перспектывы ўсіх уключаных у яго стварэнне актараў.

ЛІТАРАТУРА

1. Беньямин В. Книга пассажей: заметки и материалы. Конволют А: Пассажи, магазины модных товаров, приказчики // Versus. – 2022. – Т. 2, №. 3. – С. 172–210.
2. Грунтоў С. Пустыя магілы. Грамадзянскія кенатафы ў Беларусі ў ХХ ст. // Беларускі фальклор. – 2023. – Вып. 10. – С. 108–124.
3. Грунтоў С.У. Фатаграфія і культура памяці ў беларусаў у другой палове ХІХ – пачатку ХХІ ст. – Мінск: Беларус. навука, 2023. – 189 с.
4. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 1001. Воп. 1. Спр. 17.
5. ДАВВ. – Ф. 1001. Воп. 1. Спр. 241.
6. Жернова, могильный камень. Лот №5034255800 [Электронный ресурс]. – URL: http://ay.by/lot/zhernova-mogilnyj-kamen-iudaizm-tora-staryj-ivrit-19-vek-5034255800.html. (дата обращения: 30.05.2023).
7. Зенкин С. Небожественное сакральное: теория и художественная практика. – 2-е изд. стер. – М.: Изд. ц-р РГГУ, 2014. – 536 с.
8. Лісейчыкаў Д. «Ходилъ до церкви и тамъ надгробокъ писаныи виделъ...»: кірылічныя надмагіллі XVI – XVII стст. на землях Вялікага Княства Літоўскага // Epitaphium: пахавальная культура народаў Вялікага Княства Літоўскага: зб. арт. / склад.: С.У. Грунтоў, Д.В. Лісейчыкаў. – Мінск: НГАБ, 2022. – С. 69–101.
9. Соколова А.Д. Новому человеку – новая смерть?: похоронная культура раннего СССР. – М.: Нов. лит. обозрение, 2022. – 453 с.
10. Улада і грамадства: БССР у 1929–1939 гады ў дакументах Сакрэтнага аддзела / Асобага секрата ЦК КП(б)Б / Склад., аўтар прадм. І. Раманава. – Вільня: Логвінаў, 2019. – 1120 с.
11. Kałamajska-Saeed, M. Kościół parafialny p.w. ŚŚ. Piotra i Pawła oraz klasztor Bernardynów w Iwiu // Kościoły i klasztory rzymokatolickie dawnego województwa Wileńskiego. – Kraków: Międzynarodowe Centrum Kultury, 2011. – T. 4. – S. 55–112.
12. Krótki zarys dziejów kościołka zbudowanego na cmentarzu katolickim w miasteczku Iwieńcu gubernji mińskiej. – Iwieniec: Skład Wydawnictwa u Proboszcza Iwienieckiego, 1909. – 40 s.

*Паступіў 21.04.2023*

## ПОВТОРНОЕ ИСПОЛЬЗОВАНИЕ НАДГРОБИЙ В БЕЛАРУСИ: ФОРМЫ, ПРАКТИКИ, РЕЦЕПЦИИ

***С.В. ГРУНТОВ***
***(Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси, Минск)***

*В статье рассматриваются практики повторного использования надгробий в Беларуси, преимущественно на примерах, относящихся к концу XIX – началу XXI века. Выделяются основные формы повторного использования памятников в зависимости от их прагматики. Повторное использование показывается как устойчивая культурная форма. Рассматриваются причины табуирования повторного использования памятника в культуре. Рассматривается проблема десакрализации и те варианты повторного использования памятников, где она не происходит.*

***Ключевые слова:*** *кладбище, памятник, надгробие, мацева, десакрализация, мемориальная архитектура.*

## REUSE OF TOMBSTONES IN BELARUS: FORMS, PRACTICES, RECEPTIONS

***S. HRUNTOU***
***(the Center for the Belarusian culture, language and literature researches of the NAS of Belarus, Minsk)***

*The article discusses the practice of reusing gravestones in Belarus, mainly on examples dating back to the end of the 19th - beginning of the 21st century. The main forms of reuse of monuments are distinguished depending on their pragmatics. Reuse is shown as a sustainable cultural form. The reasons for tabooing the reuse of the monument in culture are considered. The problem of desacralization and those options for the reuse of monuments where it does not occur are considered.*

***Keywords:*** *cemetery, monument, headstone, matzevas, desacralization, memorial architecture.*